Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

# АСНОВЫ КОЛЕРАЗНАЎСТВА

*Вучэбная праграма*
*для вышэйшых навучальных устаноў*
*па спецыяльнасці 1- 18 01 01 “дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”*
*па напрамку1-15 02 01-07*
*(“рэстаўрацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Разгледжана і рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці рабочага варыянта*
*на пасяджэнні кафедры народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва*
*Ад 28.08. 2012 пратакол №1*

*Заг. кафедрай*

__________________________ *Шаура Р.Ф.*

*Мінск 2012-09-27*

*Праграма зацверджана на паседженні кафедры*
*народнага дэкаратыўна-прыкладного мастацтва*
*Пратакол №11 ад 28.06.2012г.*
*Заг. кафедры Шаура Р.Ф.*

*Складальнік*
*выкладчы кафедры народнага*
*дэкаратыўна-прыкладного мастацтва Скіцева А. У.*

*Рэцэнзенты:*

*Слабодчыкаў У.І., дацэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў*

*Шаура Р.Ф., загадчык кафедры народнага ДПМ Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Рэкамендавана да выдання прэзідыумам вучэбна-метадычнай рады БДУ культуры і мастацтваў (пратакол № ад г.)*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Колеразнаўства – адна з дысцыплін спецыяльнага цыкла. Праграма курса разлічана на засваенне студэнтамі матэрыялу па прадмету, паслядоўнаму вывучэнню і практычнаму выкарыстанню ведаў.

Курс колеразнаўства ўключае ў сябе лекцыйны матэрыял па тэорыі колеразнаўства, практычныя заняткі і самастойнае выкананне студэнтамі вучэбных і творчых прац.

У вывучэнне прадмета «колеразнаўства» уваходзіць:

1. Лекцыйны курс;
2. Выкананне вучэбных прац з выкарыстаннем розных тэхнічных прыёмаў і сродкаў;
3. Самастойная праца студэнтаў;
4. Пашырэнне кругагляду студэнтаў (наведванне выстаў, творчых майстэрань беларускіх мастакоў, самастойныя творчыя работы);

Курс разлічаны на вывучэнні асноўных правіл і законаў колеразнаўства, з правядзеннем аналіза і тэарэтычнай падасновы выканання каляровых кампазіцый. Такім чынам, курс вывучэння асноў колеразнаўства дазваляе спалучыць тэарэтычныя і практычныя заданні.У аснову метаду вывучэння колеразнаўства пакладзена практычнае авалоданне тэхнічнымі прыёмамі і сродкамі, аналіз сусветнай мастацкай культуры, развіццё мастацка-вобразнага мыслення.

**Асноўнай мэтай** курса з’яўляецца развіццё здольнасцей студэнтаў адчуваць, бачыць і перадаваць у працы каларыстыку вобразаў, кампазіцыйнае колеравае вырашэнне работ, выкарыстанне колеру як сродка мастацкай выразнасці вобразу.

Праграма па колеразнаўству мае шырокі дыяпазон **задач курса**:

- вывучэнне і аналіз сусветнай мастацкай культуры;
- развіццё мастацкіх здольнасцей і эстэтычнага густу;
- свабоднае валоданне і выкарыстанне колеру ў творах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Выразна абмежаваная навучальная задача кожнай тэмы дазваляе эфектыўна фарміраваць у студэнтаў пэўныя навыкі ў галіне ўяўлення аб колеры, кампазіцыі, форме, прасторы, арнаменце, канструктыўных пабудоў.

Некаторыя з заданняў развіваюць творчы патэнцыял студэнтаў, а іншыя – разглядаюцца як практыкаванні. Паслядоўнасць вывучэння тэм адлюстроўвае класічны прынцып методыкі выкладання - ад простага да складанага. Гэты працэс уключае ў сябе тэарэтычныя асновы і практычнае выкананне каляровых кампазіцый. Пэўнае паэтапнае развіццё і авалоданне ведамі і навыкамі праглядваецца ў кожным заданні. У 1 семестр закладваецца падмурак асноўных прыёмаў і спосабаў, а ў другім - мастацка-вобразнае ўспрыняцце кампазіцый у колеры.

Асноўныя патрабаванні да навыкаў і уменняў студэнтаў.

*Студэнт павінен **ведаць**:*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

- асноўныя паняцці, назвы і класіфікацыі колераў і іх характарыстыкі;
- правілы і прынцыпы слагальнага і вылічальнага змяшэння колераў;
- прынцыпы пабудовы колеравых сістэм;
- асноўныя катэгорыі гармоніі, тыпы класічнай гарманічнай кампазіцыі, віды гамы і каларыту і спецыфіку іх выкарыстання;
- заканамернасць узаемадзеяння колеру з формай і прасторай;
- функцыі колеру твора дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- выразныя магчымасці колеру, абумоўленыя рысамі, плошчай, фактурай і іншымі характарыстыкамі колеравай плямы, а таксама кантэкстам яго гучання;
- разнастайнасць і прычыны ўзнікнення аптычных ілюзій;
- прыроду з’явы сінэстэзіі і віды колеравых асацыяцый;
- фактары фарміравання колеравых пераваг.

*Студэнт павінен **умець:***

- будаваць колеравыя сістэмы, вызначаць іх значнасць і аналізаваць эфектыўнасць ва ўмовах;
- ствараць колеравую схему праектуемага аб’екта і тлумачыць яе эфектыўнасць, прыстасаванасць да агульнай сістэмы выразных мастацкіх сродкаў, яе адпаведнасць дадзенай задачы;
- выкарыстоўваць магчымасці колеру і коляровых зносінаў ва ўзвышэнні выразнасці вобразнага вырашэння твора, ужывання ў дадзеных дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- выкарыстоўваць прынцыпы колеравай гармоніі для забеспячэння цэласнасці вобразнага вырашэння;
- выяўляць і аналізаваць колеравыя схемы твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Атрыманыя на тэарэтычных і практычных занятках веды замацоўваюцца і развіваюцца ў працэсе самастойнай працы студэнтаў, з’яўляючыся часткай неабходных ведаў, неад’емнай часткай мастацка-эстэтычнай адукацыі, без якой немагчыма ўтварэнне твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва на высокім прафесійным узроўні.

Вучэбным планам і праграмай прадугледжваецца правядзенне заняткаў у 1 і 2 семестрах. У праграме пазначана колькасць гадзін па тэарэтычнаму і практычнаму курсу.

Агульная колькасць вучэбных гадзін складаецца з 50 гадзін, з іх – 50 аудыторных гадзін: 6 гадзін лекцый, 44 гадзін лабараторных заняткаў. Формай кантролю па заканчэнні курса з’яўляецца прагляд работ студэнтаў і залік у 2 семестры, прагляд работ і экзамен у 1 семестры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|
| | Усяго аудытор. | лекцый | лабарат. . |
| **1 семестр** | | 4 | 24 |
| Тэма 1. Уводзіны. Асноўныя катэгорыі і праблемы навукі аб колеры. Навуковыя асновы колеразнаўства. | 2 | 2 | |
| Тэма 2. Сістэматызацыя і класіфікацыя колераў Асноўныя тыпы класічнай колеравай кампазіцыі | 2 | 2 | |
| Тэма 3. Ахраматычныя колеры ў кампазіцыі | 4 | | 4 |
| Тэма 4. Разбяленне, зачарненне, прыглушэнне храматычнага колера. Тып монахромнай кампазіцыі. | 4 | | 4 |
| Тэма 5. Гарманічныя спалучэнні зблізаных колеравых адносінаў у кампазіцыі. | 4 | | 4 |
| Тэма 6. Гарманічныя спалучэнні зблізана-кантрастных колераў. Трох, чатырохкаляровая гарманічныя спалучэнні ў кампазіцыі. | 4 | | 4 |
| Тэма 7. Віды палярнай коляровай кампазіцыі. Гарманічныя спалучэнні кантрастных і ўзаемна-дадатковых колераў. | 4 | | 4 |
| Тэма 8. Паліхромная кампазіцыя. Цеплы, халодны і змешаны тып калырыта ў кампазіцыі. | 4 | | 4 |
| **2 семестр** | | 4 | 20 |
| Тэма 9. Асацыяцыя і | | 4 | 10 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | |
|---|---|---|---|
| сімволіка колеру. Псіхалагічнае ўздзеянне колеру. | | | |
| **Тэма** 10. Традыцыі і сучаснасць. Колер у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве Беларусі. Гісторыя колеразнаўства. | | | 10 |
| **Усяго** **122** | 50 | **6** | **44** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### 1 семестр

**Тэма 1.** Уводзіны. Асноўныя катэгорыі і праблемы навукі аб колеры. Навуковыя асновы колеразнаўства.

Агульнае ўяўленне аб пытаннях колеразнаўства, як навукі аб колеры ў тэорыі і практыцы выяўленчага мастацтва і эстэтычным выхаванні.

**Тэма 2.** Сістэматызацыя і класіфікацыя колераў. Асноўныя тыпы класічнай колеравай кампазіцыі.

Фізічныя асновы колеру. Асноўныя характарыстыкі светавых хваляў.

Аптычны спектр. Сістэма псіхафізічных характарыстык. Віды каляровых колаў (8, 6, 10, 12 – ступенных).

Асноўныя асаблівасці ўспрыняцця колера. Каляровы кантраст. Каляровы нюанс.

Паняцці "гармоніі" і "каларыта" у кампазіцыі.

**Практычныя заняткі**

*Інструменты і абсталяванне*

Для выканання вучэбных і самастойных прац па "Колеразнаўству" студэнтам патрэбны розныя па якасці алоўкі, пэндзлі, планшэты для выканання графічных работ, папера белая і каляровая, акварэль, гуаш, тэмпера, акрыл, каляровыя алоўкі, туш і г.д.

**Тэма 3.** Ахраматычныя колеры ў кампазіцыі

*Заданне 1.* Выканаць ахраматычны рад ад белага да чорнага колеру метадам грызайль такім чынам, каб паміж імі было 7 шэрых колераў.

*Заданне 2.* Выканаць дэкаратыўную кампазіцыю, выкарастоўваючы гарманічныя ахраматычныя дыады і трыяды.

*Заданне 3.* Выканаць дэкаратыўную кампазіцыю ў светла, сярэдне і цемна шэрым дыяпазоне.

**Тэма 4.** Разбяленне, зачарненне, прыглушэнне храматычнага колера. Тып монахромнай кампазіцыі.

*Заданне 4.* Пабудаваць аднатонавыя гармонічныя спалучэнні, выкарыстоўвючы адзін каляровы тон і ўсе святлотныя дыяпазоны.

*Заданне 5.* Выканаць дэкаратыўныя монахромныя кампазіцыі на нюансныя і кантрастныя адносіны, выкарыстоўваючы колеры з радоў разбялення, зачарнння, прыглушэння храматычнага колера.

**Тэма 5.** Гарманічныя спалучэнні зблiжаных каляровых адносінаў у кампазіцыі.

*Заданне 6.* Выканаць 4 каляровыя табліцы ў наступных дыапазонах: жоўта-чырвоным, жоўта-зяленым, зялена-сінім, сіне-чырвоным. Галоўныя колеры гарманізуюцца шляхам змязнення каляровага тона, насычанасці, яркасьці і святлотных адносін.

*Заданне 7.* Выканаць 1 дэкаратыўныя кампазіцыі на кожную групу зблiжаных колераў.

**Тэма 6.** Гарманічныя спалучэнні зблiжана-кантрастных колераў. Трох, і чатырохкаляровыя гарманічныя спалучэнні ў кампазіцыі.

*Заданне 8.* Выканаць дзве колеравыя табліцы трох і чатырохколеравых спалучэнняў па 12-ступеннаму каляроваму колу В.Бецольда.

*Заданне 9.* Выканаць дэкаратыўныя кампазіцыі, каляровая аснова якіх складаецца з трыады асноўных колераў.

**Тэма 7.** Віды палярнай кампазіцыі. Гарманічныя спалучэнні кантрастных і ўзаемна-дададатковых колераў.

*Заданне 10.* Выканаць гарманічныя кампазіцыі кантрастных і ўзаемна-дададатковых колераў.

**Тэма 8.** Паліхромная кампазіцыя. Цеплы, халодны, змешаны тып каларыта ў кампазіцыі.

*Заданне 11.* Стварэнне стылізаваных дэкаратыўных кампазіцый у розных каларытах (цёплым, халодным, змешаным). Вызначыць асноўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

псіхалагічныя адносіны індывідуума да розных каларыстычных кампазіцый, колеравыя прыярытэты і асаблівасці ўспрыняцця.

*Самастойная праца студэнтаў.* Самастойнае выкананне і афармленне вучэбных і творчых прац, падрыхтоўка да прагляду.

У канцы семестра – прагляд (экзамен).

## 2 семестр

**Тэма 9.** Ассацыяцыя і сімволіка колеру. Псіхалагічнае ўздзеянне колеру.

*Заданне 12.* Асноўныя заканамернасці ўспрымання колеру. Распрацоўка колеравых кампазіцый, якія найбольш поўна адпавядаюць задачы ўзаемаіснавання пластычнай формы і каляровага вобразу. Выконваюцца цыклы дэкаратыўных кампазіцый па тэмах:

- Смакавыя ассацыяцыі (салодкае, саленае, кіслае, горкае і т.д.)
- Пазітыўная, негатыўная, нейтральная каляровая кампазіцыя.
- Колер і літаратура

**Тэма 10.** Традыцыі і сучаснасць. Колер ў дэкаратыўна-прыкладном мастацтве Беларусі. Гісторыя колеразнаўства.

*Заданне 13.* Аналіз твораў класічнага мастацтва, выкананне каларыстычных кампазіцый, характэрных для мастакоў розных стылістычных напрамкау.

*Самастойная праца студэнтаў.* Самастойнае выкананне і афармленне вучэбных і творчы’ прац, падрыхтоўка да прагляду.

У канцы семестра праводзіцца прагляд (залік).

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАГЛЯДАЎ

## (БЯГУЧЫХ, ЗАЛІКОВЫХ, ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫХ)

Формай кантролю праходжання студэнтамі спецыяльнай дысцыпліны з’яўляецца прагляд. Прагляды падзяляюцца на бягучыя, заліковыя, экзаменацыйныя.

Бягучыя прагляды праводзяцца на працягу вучэбнага семестра для завяршэння этапу працы над вучэбным заданнем (праз 1 – 1,5 месяца).

На заліковы ці экзаменацыйны прагляд студэнты прадстаўляюць цалкам завершаныя, выкананыя на планшэтах ці замоўленых фарматах, графічныя праекты і заданні. Выкананае заданне павінна адпавядаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зададзенай тэме, адказваць асноўным патрабаванням графічнай падачы, несці неабходную паяснядьную інфармацыю, мець эстэтычны выгляд.

На заліковы і экзаменацыйны прагляд студэнты павінны выставіць усе заданні, якія прапрацоўваліся на працягу семестра. Частковае выкананне тэм, або незавершанае экспанаванне праекта уплывае на канчатковую адзнаку навучэнца.

## ВЫКАРЫСТАННЕ ТС, АЎДЫЁ ВІДЭАМАТЭРЫЯЛАЎ

У навучальным працэсе па прадмету выкарыстоўваюцца матэрыялы з метадычнага фонду, які захоўваецца ў аўд. 834.

Матэрыялы па тэмах:

1. Колеравыя асацыяцыі
2. Адценні колеру
3. Каларыты
4. Дэкаратыўныя нацюрморты
5. Колер і жывапіс
6. Колер і літаратура
7. Колер і музыка
8. Колер і архітэктура
9. Стварэнне візуальнага вобразу

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ ДЛЯ САМАПРАВЕРКІ СТУДЭНТАЎ

1. Назваць асноўныя суб’ектыўныя якасці ўспрымання колеру.
2. Што такое “паслядоўны кантраст”?
3. Што з’яўляецца асновай колеравай гармоніі?
4. Растлумачце тэрмін “колеравы дысананс”.
5. Эмацыянальнае ўздзеянне колеру.
6. Што такое “каларыстычная гармонія” ў колеразнаўстве?
7. Храматычныя і ахраматычныя колеры.
8. Што такое “гарманічныя колеры”?
9. Колер, як адзін з асноўных сродкаў арганізацыі гарманічнай кампазіцыі.
10. Паняцце “колеравага тона”, “насычанасці”.

## ЛІТАРАТУРА

АСНОЎНАЯ:

1. *Агостон, Ж.* Теория цвета и её применение в искусстве и дизайне. / Ж.Агостон — М, 1982.—184с., ил.
2. *Бер, У.* Что означают цвета. / У.Бер — Ростов-на-Дону, 1997.—224с.
3. *Волков, И.Н.* Цвет в живописи. / И.Н.Волков — М, 1984.—320с.
4. *Дерибере, М.* Цвет в деятельности человека. / М.Дерибере — М, 1964.—183с.
5. *Иванов, В.И.* О цвете в живописи. / В.И.Иванов — М: Юн. худ, 2002.—30с.
6. *Иттен, И.* Искусство цвета. / И.Иттен — М, 2001.—96с, ил.
7. *Лущеко Э.М.* Теория цвета: уч. пос. / Э.М Лущеко — Л, 1980.—30с., ил, табл.
8. *Миронова Л.Н.* Цветоведение. / Л.Н. Миронова — Мн, 1984. – 286с., ил, цв. вкл.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9. *Миронова Л.Н.* Полезные советы по колористике.\\ ПроДизайн. Л.Н.Миронова – Вып.2.—С.62-65.
10. *Миронова Л.Н.* Цвет в изобразительном искусстве. / Л.Н.Миронова — Мн, 2002.—151с..

ДАДАТКОВАЯ:

1. *Ивенс Р.М.* Введение в теорию цвета. / Р.М.Ивенс — М, 1964.—442с, ил.
2. *Люшер М.* Цвет вашего характера. / М.Люшер — М, 1996.
3. Психология цвета: сб. статей.— М, 1996.—352с.
4. *Степанов Н.Н.* Цвет в интерьере: уч. пос. / Н.Н.Степанов — Киев, 1985.—184с., ил.
5. *Фрилинг Г.* Человек. – Цвет. – Пространство. / Г.Фрилинг, К.Ауэр – М,1973. – 141с., ил.
6. *Хаханова Л.Н.* Цвет в интерьере жилого дома. / Л.Н.Хаханова – Школа и производство.—1997, №3.— С.35-40.
7. Цветовой строй композиции: практические задания.— М, 1989.—28с.
8. *Чидзиива Х.* – Гармония цвета: руководство по созданию цветовых комбинаций. / Х.Чидзиива – М, 2003. – 142 с., ил.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ